# ТРЭЦЯЕ ПАСЛАНЬНЕ ЯНА БАГАСЛОВА

1 Старац - любаснаму Гаію, якога я ў ісьціне люблю.
2 Любасны! малюся, каб табе здаровілася і шчасьціла ва ўсім, як шчасьціць душы тваёй.
3 Бо я вельмі ўсьцешыўся, калі прыйшлі браты і засьведчылі пра тваю вернасьць, як ты ходзіш у ісьціне.
4 Няма мне большае радасьці, як чуць, што дзеці мае ходзяць у ісьціне.
5 Любасны! ты як верны дзееш у тым, што робіш братам і вандроўнікам;
6 яны засьведчылі перад царквою пра любоў тваю; ты добра зробіш, калі адпусьціш іх, як яно трэба дзеля Бога,
7 бо яны дзеля імя Ягонага пайшлі, ня ўзяўшы нічога ад язычнікаў.
8 Дык вось павінны мы прымаць іх такіх, каб зрабіцца спрыяльнікамі ісьціне.
9 Я пісаў быў царкве; але Дыятрэф, які любіць быць першым у іх, ня прымае нас.
10 Таму, калі я прыйду, дык узгадаю ўчынкі, якія ён робіць, ганячы словамі ліхімі нас, і, не задавальняючыся гэтым, і сам ня прымае братоў, і забараняе тым, што жадаюць прымаць, і выганяе іх з царквы.
11 Любасны! не ўпадабняйся ліхому, а добраму. Хто робіць дабро, той Божы; а хто робіць ліха, ня бачыў Бога.
12 Пра Дзімітрыя засьведчылі ўсе і сама ісьціна; сьведчым таксама і мы, і вы ведаеце, што сьведчаньне нашае ў ісьціне.

13 Многае меўся я напісаць; ды не хачу пісаць табе
чарнілам і трысьцінкаю,
14 спадзяюся ж бо неўзабаве пабачыць цябе і
пагутарыць вуснамі ў вусны.
15 Мір табе! вітаюць цябе сябры; павітай сяброў
паіменна. Амін.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc